УДК 82.091

**І. С. Крыштоп**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы, Рэспубліка Беларусь, inessa_top@mail.ru*

# ЭКАЛАГІЧНАЯ ПРАБЛЕМАТЫКА Ў БЕЛАРУСКАЙ І КІТАЙСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX СТАГОДДЗЯ

У артыкуле разглядаюцца асноўныя значэнні вылучаных на аснове параўнальна-тыпалагічнага метаду экалагічных матываў у творчасці беларускіх і кітайскіх паэтаў другой паловы XX стагоддзя. Устаноўлена, што распаўсюджванне экалагічнай праблематыкі ў творчасці пісьменнікаў абумоўлена сацыяльнымі, навуковымі і тэхналагічнымі фактамі існавання нацый. Як правіла, паэты акцэнтуюць увагу на разуменні чалавечай душы праз прыродныя з'явы. Больш таго, стасункі чалавека і прыроды выяўляюць напрамак да паляпшэння існуючага свету.

**Ключавыя словы:** экалагічны матыў; параўнальна-тыпалагічнае даследванне; матыўны аналіз; прырода; беларуская паэзія; кітайская паэзія.

**I. S. Kryshtop**
*Institution of Education "Baranavichy State University", Baranavichy, the Republic of Belarus, inessa_top@mail.ru*

# ECOLOGICAL ISSUES IN BELARUSSIAN AND CHINESE LITERATURE OF THE SECOND HALF OF THE XX CENTURY

The article examines the main meanings of ecological motifs in the works of Belarussian and Chinese poets of the second half of the 20th century. It is established that the wide appeal to ecological problems in the works of writers is caused by social, scientific and technological facts of human existence. As a rule, poets emphasize the importance of understanding of a human soul through natural phenomena. Moreover, the relationship between a man and nature can reveal directions for improving the existing world.

**Key words:** ecological motif; comparative research; motif analysis; nature; Belarussian poetry; Chinese poetry.

© Крыштоп І. С., 2024

Рэпазіторый БарДУ

**Уводзіны.** У другой палове XX стагоддзя адбываецца «экалагізацыя» розных навуковых галін, у тым ліку гэты працэс закрануў і літаратуразнаўства. Так, на прыканцы мінулага стагоддзя паступова ў тэорыі літаратуры фарміруецца экакрытыка. Як шырокае паняцце яна разглядае любы твор, што ў той ці іншай ступені тычыцца тэмы прыроды, навакольнага асяроддзя і ўзаемаадносін чалавека з імі. Аднак на дадзены момант застаецца неўсталяванай тэрміналагічная база даследаванняў мастацкай літаратуры аб прыродзе: выкарыстоўваюцца «экапаэтыка», «літаратура аб прыродзе», «натурфіласофская літаратура (проза)», «літаратура аб навакольным асяроддзі», «экасофская літаратура», «экалітаратура», «літаратура Антрапацэна», а таксама шматлікія англамоўныя варыянты: "environmental literature", "nature writing", "ecofiction", "ecological literature", "place-based literature", "nature-oriented literature", "climate fiction" і інш.

У гісторыі сусветнай літаратуры нямала прыкладаў звароту да прыроды не толькі як крыніцы натхнення, але і матэрыялу для стварэння мастацкага вобраза. Больш таго, пісьменнікі ўключаюць апісанні пейзажа ў сюжэтную матывіроўку, кампазіцыю, выкарыстоўваюць у якасці фону для характарыстыкі персанажаў. Пачынаючы з эпохі Рамантызму, знакамітыя класікі сусветнай літаратуры У. Вордсворт, Дж. Байран, Г. Гейне, А. Пушкін, М. Гогаль, Л. Талстой, Т. Ман, У. Фолкнер, Р. Ралан, А. Камю і іншыя лічылі прыроду пачаткам усіх эстэтычных і этычных крытэрыяў. Не сталі выключэннем прадстаўнікі беларускай і кітайскай літаратуры. Так, у творах Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, К. Буйло, Лі Бо, Ван Вэй Хай Цзы, Лу Яо, Гу Хуа і іншых апісанні прыгажосці навакольнага свету адлюстроўваюць патрыятычныя пачуцці, цвёрдую перакананасць у самакаштоўнасці прыроды, эстэтычнае захапленне.

Так як поле мастацкіх стасункаў чалавека і прыроды вельмі шырокае, мэтай дадзенага даследавання з'яўляецца вызначэнне спецыфікі эстэтыка-этычнага ўвасаблення прыроды ў творчасці беларускіх і кітайскіх паэтаў другой паловы XX стагоддзя.

Дзеля дасягнення азначанай мэты выкарыстаны параўнальны, культурна-гістарычны, герменеўтычны метады і матыўны аналіз тэкстаў. Зварот да паэзіі абумоўлены тым, што менавіта яна дазваляе чалавеку выказаць у канцэнтраваным выглядзе маральны і эстэтычны досвед.

Рэпазіторый БарДУ

**Асноўная частка.** Праблема гарманізацыі адносін чалавека з грамадствам і прыродным асяроддзем праходзіць праз усе асноўныя філасофскія школы Кітая, што склалі фундамент для развіцця сучаснай мастацкай культуры ўвогуле і літаратуры ў прыватнасці. Як правіла, у творах мастацкай літаратуры знаходзіць адлюстраванне даасізм, што сцвярджае ўзаемную дадатковасць двух палярных фактараў інь і янь, якія акцэнтуюць, з аднаго боку, цэласнасць быцця, з другога — зменлівасць усяго існага: «Не бачыў вясны цвіцення, / Свету не ўуспрымаў» [1, с. 258].

Таксама на сучасным этапе сінтэз ідэй даасізму і класічнага канфуцыянства вызначае агульную логіку ўзаемадзеяння асноўных кампанентаў сістэмы «прырода — чалавек — грамадства», якая шырока прадстаўлена ў літаратурных творах. Гэта дапамагае пазбегнуць іх неапраўданага супрацьпастаўлення і дае магчымасць выкрыць узаемапранікальныя ўтварэнні, таму традыцыйна прырода і чалавек разглядаюцца ў дыялектычным адзінстве [2].

У лірычных творах Лінь Ман, Ман Кэ, Янь Чжэнь, Ло Гэн’е і іншых прадстаўнікоў кітайскай літаратуры другой паловы XX стагоддзя яскрава выяўляецца ідэя яднання чалавека і Неба, што паглыбляе зразуменне таямніц жыцця і мыслення, выкрывае высокія маральныя адносіны чалавека да краіны і прыроды: «Ляціце, галубы, пад ясным небам, / Ляціце, галубы, куды вам трэба. / Сягоння шыры небныя свае / Мая айчына вам перадае» [1, с. 187]; «Я незадаволены — крыкнуць хачу ўсім, каго ноч прывяла! / Гэта бурлівая хваля — рэчышча цеснае ёй, / Яна — куранё, яго не ўтрымаць у цемрыве яйка вясной» [1, с. 194]; «Жыццё — не сад, дзе кветкі ўсе растуць, / Няма і кветак, ўто ўвесь год цвітуць. / Але жыццё — і не бязмеж пустынь: Ёсць зеляніна траў і неба сінь <…> Ёсць смех праз слёзы, ёсць — наадварот…» [1, с. 199].

Відавочна, што паходжанне, існаванне і ўдасканаленне аб’ектаў навакольнага асяроддзя, згодна карціне свету жыхароў КНР, выводзіцца з працэсаў іх узаемадзеяння. Таму асноўнай мэтай паэтаў выс-тупае гарманізацыя адносін прыроды і чалавека. Аднак падставай для ўзнікнення перашкод з’яўляецца ярка выражаны сацыяцэнтрызм з прыматам агульнага над прыватным, а таксама акцэнт на паводніцкім аспекце, на які ў сваю чаргу арыентуецца сучасная экалагічная свядомасць: «Калі ты застаешся ўсяго толькі / безудзельным гледачом, / Гэта глупства. Але ж і злачынства»;

Рэпазіторый БарДУ

«Абараняць прыроду — значыць, / абараняць камароў у тым ліку. / Ды рэчаіснаць паказвае, што гэта надзвычай цяжка» [1, с. 290].

Матыў папярэджання чалавецтва аб наступствах сваіх дзеянняў выразна гучыць у паэтычных радках кітайскіх аўтараў: «Паслухай: калі ўжо ш зоркі з неба / могуць некуды знікнуць, / А на зямлі паўтарыцца ляднікові перыяд, / І калі можа знікнуць бясследна / заўтра ўсё чалавецтва, / Калі ад радасці застануцца / толькі адны ўспаміны…» [1, с. 189]; «І шчэрыцца-цешыцца бура. / Пачула стыхія сіл грозных правы. / Усё, што было нам спадзевам, Ўкруціла ў раз'юшаны шквал віхравы, / Над кожным узнеслася дрэвам. / З веку старога ў новы наш век / Табе папярэджанне, чалавек» [1, с. 189]. Для насельніцтва Зямлі застаецца адзіны выхад — аптымізацыя сацыяпрыроднага ўзаемадзеяння ці нават яднанне прыроды, чалавека і духу.

Тым не менш кітайскія паэты разглядаюць чалавека і як вышэйшую праяву прыроды: выяўляюць разуменне прыроды, што ўзнікае ў свядомасці чалавека дзякуючы духоўна-маральнай сутнасці яго самога: «Нехта жыве, як зжухлы восеньскі ліст, / Іншы — як прамяністая, вабная небная зорка; / Гэты ў зямлю як не ўрос, быццам струхлелы пень, / А той расцвітае, энергіі, дужасці поўны, / Арол ён, скакун!» [1, с. 200].

Больш таго, чалавек Усходу, не выключаючы дзейны, актыўны пачатак, ставіць перад сабой мэту навучыцца кіраваць законамі прыроды, але ідзе да гэтага шляхам, адрозным ад таго, што звычайна выбірае чалавек Захаду: не адлучае сябе ад прыроды, не супрацьпастаўляе сябе ёй: «Я на зямлі, пустой і бясплоднай, / Упарта пішу: “Вер у будучыню, вер!”»; «…Кастрычнік, брат восені — / ад аднае і тае ж маці, / нараджаюцца ў адначассе і ўраджай і страта» [1, с. 297].

У сілу сваёй спецыфікі надзвычай багатая на экалагічныя матывы кітайская паэзія, прысвечаная сельскаму жыццю. Яна заключае ў сабе аўтарскае духоўна-ўзвышанае стаўленне да прыроды. Гэтаму спрыяюць сімволіка колеру і гукаў: «Мая бабуля закашляла — і прачнулася тысяча пеўняў. / Тысяча пеўняў запела — І разбудзіла тысячу чалавек. / Людзі выйшлі на вуліцу, / вясковыя пеўні гарланяць» [1, с. 291].

Беларускае мастацтва слова другой паловы ХХ стагоддзя таксама ў значнай ступені імкнецца захаваць сутнасць традыцыйнай беларускай культуры, для якой характэрна сінтэтычная інтэрпрэтацыя адносін чалавека і навакольнага свету: жыццё прыроды трактуецца як



Репозиторий БарГУ

арганічная частка чалавечага лёсу: «Дыван вясны перацвітае ў лета, / Завея лісцяў — у сняжынак пух; / Я не хачу, каб некалі ўсё гэта, — Хаця б на момант, свой спыніла рух» [3, с. 21]; «Мне кожны год, нібы жыццём другім, / Жыць у дваццаты век наш давялося…/ Я — якіяна жытняга калоссе: Мільёны лёсаў змешчаны ў маім, — / Яшчэ да дна не вычарпаным, лёсе» [3, с. 22]; «Лес і поле — чарнатроп. / Не бяжы, прырода. Стоп, / Вось мой край, мая радзіма!» [3, с. 70]. Больш таго, у беларускай літаратуры існуюць розныя па структуры вобразы прыроды, аднак большасць з іх грунтуецца на прынцыпе ўзаемаадбівання чалавечага жыцця і прыроднай стыхіі: «Мы не знаходзім панацеі / Ад паражэнняў, страт і крыўд. / Жыве ўсё лепшае ў надзеі, / Як нетутэйшы краявід» [3, с. 72].

Не будзе перабольшаннем адзначыць, што для айчынных пісьменнікаў прырода з'яўляецца ўвасабленнем маральных ідэалаў і памкненняў. Адпаведна, філасофія прыроды дапамагае ў раскрыцці такіх сэнсаўтваральных паняццяў, як Сусвет, Прыгажосць, Дабрыня і гэтак далей. Ідэі маральнага ўдасканалення, адмова ад неўтаймаванага спажывецтва, культ продкаў і традыцый, гармоніі чалавека і навакольнага свету выразна гучаць у творах П. Панчанкі, А. Сыса, А. Куляшова, І. Рубіна, А. Пысіна і іншых: «Мяркуй, што робіш для душы свёй — / Шпакоўню, вулей, сціплую кармушку: / Падобны ў чымсці на пчалу і птушку, / Ты б мог прыйсці ў свет птушкаю, пчалой…» [3, с. 75]; «…я — зялёны лісцік / магутнага радаводнага дрэва зямлянаў <…> Але вясной / 2999 года / мне ўспамінаецца канец якойсьці вайны / быццам бусел з абпаленымі крыламі я стаю на папялішчы / а можа гэта /не я?» [4, с. 31]; «…на вясковым пагосце збаўляюцца людзі ад злосці, / ён, як гай запаветны, здзўляе спакоем душу» [4, с. 41].

Працягваючы характэрную для беларускага нацыянальнага менталітэту традыцыю, мастацтва слова менавіта ў невычэрпнасці жыццёвых сіл прыроды бачыць крыніцу развіцця чалавека, пераадольванне ім сацыяльнай дысгармоні, а вечнае абнаўленне прыроды ўспрымаецца як сімвал духоўнага адраджэння чалавека: «Калі за лета не ўбачу жыта — / Зраблюся хворым» [5, с. 225]; «Пачакай: яшчэ сонца выгляне. / Сонца выгляне — будзем жыць» [4, с. 185]; «Вельмі сыта жыць мы пачалі, / Не знаходзім дарагога слова / Для вавёркі, ластаўкі, пчалы» [4, с. 77]; «І хоць кажуць, што цвітуць увесну / нават карча-

Репозиторий БарГУ

ваных дрэў камлі, — / я ў сваіх нашчадках не ўваскрэсну: кожны з нас — апошні на Зямлі» [4, с. 184].

У другой палове XX стагоддзя ў «экалагічных» творах прадстаўнікоў беларускай літаратуры назіраецца змяненне акцэнтаў: ад сентыментальнага спачування да разумення пагрозы чалавечаму існаванню: «Душна ад жалезнага прагрэсу: / Вінаваты ўсе мы — ты і я : / Каб адчуць сцюдзены водар мяты, / За сто вёрст ляціць мая сям'я» [5, с. 208].

Асабліва значныя наступствы не толькі для навольнага асяроддзя, але і беларускай літаратуры мела аварыя ў Чарнобылі: з'явілася больш за 500 вершаў і паэм. Беларускі пісьменнік А. Адамовіч вызначыў ролю трагедыі наступным чынам: «Да Чарнобыля і пасля Чарнобыля — гэта featnae светаадчуванне, гэта па-новаму небяспечныя шляхі чалавецтва ў будучыню» [6, с. 38]. Першымі водгукамі-рэакцыямі сталі вершаваныя радкі Н. Гілевіча, А. Вялюгіна, Р. Барадуліна, М. Мятліцкага, А. Грачанікава, М. Танка і інш. Слушна адзначае вядомы літаратуразнаўца А. І. Бельскі: «…беларуская літаратура пачала асэнсоўваць Чарнобыль, апелюючы да традыцыйнага народнага вопыту і культурнай памяці чалавецтва, найперш да Бібліі, яе універсальных вобразаў. Яна імкнулася разгадаць і асэнсаваць феномен Чарнобыля як містычную з'яву, фантасмагорыю» [7].

Катастрофа спарадзіла хаос не толькі ў традыцыйным укладзе жыцця звычайных беларусаў, але і завастрыла праблему супрацьстаяння жыцця і смерці ў многіх паэтычных творах. Таму ў іх «ўзмацняюцца трывога и заклапочанасць усеагульным лёсам чалавецтва» [8, с. 28]. Вобразы атручанай зямлі, мёртвай зоны — адны з асноўных у творах М. Танка, А. Канапелькі, С. Давідовіча, А. Вялюгіна, Г. Бураўкіна, М. Мятліцкага і многіх іншых. Звычайна ў іх матыў смерці сэнсава дапаўняецца ідэямі бежанства, выгнання, страты карэнняў, плачу, тугі, гора. Душэўны стан лірычных герояў зліты з прыродным наваколлем. Напрыклад, маштабы экалагічнай катастрофы выразна ўяўляе П. Панчанка ў вершы «Аб самым смачным...». Ён даводзіць, што Чарнобыль нясе смерць і малому, і вялікаму, наступным за знікненнем прыроды будзе чалавек. Гэтую ж думку падзяляе і А. Пысін, які звяртаецца з пытаннем да чытача: «Цяжка ўздыхае зямля-парарадзіха: / Заўтра якое ўзаўецца дзіця?» [3, с. 80].

Аднак беларусы справіліся з немагчымым — не адступілі перад навалай, не здаліся [9, с. 75]. Таму адчуваецца аптымістычны



Репозиторий БарГУ

настрой і вера ў чалавечыя магчымасці у творах М. Мятліцкага, які піша: «Зямля — адзіны чалавечы дом. / Нам жыць і дыхаць толькі на зямлі» [10, с. 48].

**Заключэнне.** І ў кітайскай, і ў беларуская паэзіі тэме ўзаемаадносін чалавека і прыроды прысвячаны самыя пранікнёныя радкі. У іх прыроднае асяроддзе паўстае не толькі як матэрыяльны нацыянальны набытак, але і неад’емная аснова духоўнасці нацыі, развіцця яе культуры, таму заўсёды падкрэсліваецца ідэя адказнасці чалавека за навакольную рэчаіснасць. У беларускім мастацтве слова, як і кітайскім, афармляецца ідэя двубаковасці чалавека: з аднаго пункту гледжання, ён — пераўтваральнік і наладжвальнік, а з другога — захавальнік, які не толькі і нават не столькі ўладарыць над прыродай, колькі садзейнічае сваёй працай раскрыццю яе ўнутраных сіл, росквіту схаваных у ёй магчымасцей.

Таксама паэты абедзвюх краін імкнуцца перадаць мастацкімі сродкамі агульную карціну і прадбачыць будучыню чалавека і прыроды. Мастацкая свядомасць сцвярджае: не захаваўшы прыроды, чалавецтва не зможа захаваць сябе. Больш таго, у аксіялагічнай сістэме пісьменнікаў Беларусі і Кітая прырода асацыюецца з такімі паняццямі, як радзіма, прыгажосць, каханне, праца.

Рэпазіторый БарДУ

**Спіс цытуемых крыніц**

1. Пялёсткі лотаса і хрызантэмы: сто паэтаў Кітая XX стагоддзя / уклад. А. Карлюкевіч ; пер. з кіт. М. Мятліцкага. — Мінск : Маст. літ., 2018. — 337 с.
2. *Тугулова, О. Д.* Поэтическая судьба КНР в эпоху Мао [Электронный ресурс] / О. Д. Тугулова // Современная филология : материалы Междунар. науч. конф., Уфа, апр. 2011 г. — Уфа : Лето, 2011. — Режим доступа: https://moluch.ru /conf/phil/archive/23/508 . — Дата доступа: 09.03.2022.
3. Залатое жыта : зборнік вершаў паэтаў Магілёўшчыны / уклад. Л. М. Галубовіч. — Мінск : Літ. і Маст., 2009. — 128 с.
4. Я хацеў б вам сказаць… : вершы, паэмы / уклад. В. Шніпа. — Мінск : Маст. літ., 2008. — 302 с.
5. *Панчанка, П.* Выбраныя творы : для ст. шк. узросту / П. Панчанка ; уклад. В. Шніп. — Мінск : Маст. літ., 2009. — 238 с.
6. *Адамовіч, А.* Апакаліпсіс па графіку / А. Адамовіч ; пер. з рус. мовы М. Тычыны. — Мінск : Беларусь, 1992. — 159 с.
7. *Бельскі, А. І.* Чарнобыльская міфатворчасць як выяўленне катастрофы свядомасці (на матэрыяле беларускай паэзіі) [Электроны рэсурс] / А. І. Бельскі // Электронная библиотека БГУ. — Рэжым доступа: http://elib.bsu.by/handle /123456789/54124 . — Дата доступа: 21.01.2024.

8. *Гараднiцкi, Я. А.* Беларуская лiтаратура другой паловы XX ст. (аўтары, жанры, стылi) / Я. А. Гараднiцкi ; навук. рэд. У. В. Гнiламёдаў. — Мiнск : Бел. думка, 2022. — 231 с.

9. *Федарцова, Т. М.* Асаблiвасцi паэтычнага светаадчування Мiколы Мятлiцкага / Т. М. Федарцова // Труды БГТУ. Серия 4. — 2017. — № 1. — С. 71—76.

10. *Мятлiцкi, М.* Чаканне сонца: вершы / М. Мятлiцкi. — Мiнск : Маст. лiт., 1994. — 222 с.

УДК 347.6

**К. В. Пашкевич**
*Учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Республика Беларусь, kristina_pashkevich00@mail.ru*

# СРАВНИТЕЛЬНЫЙ АНАЛИЗ ИНСТИТУТА НАСЛЕДОВАНИЯ В КИТАЕ И РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ

В статье представлены не только особенности наследственного права в Китайской Народной Республике, но и дается обзор наследственных отношений и их регулирования. Также проводится сравнительный анализ с наследственным законодательством Республики Беларусь.

**Ключевые слова:** наследственное право; наследование по закону; наследование по завещанию; наследодатель; наследники.

**K. V. Pashkevich**
*Institution of Education "Baranavichy State University", Baranavichy, the Republic of Belarus, kristina_pashkevich00@mail.ru*

# COMPARATIVE ANALYSIS OF THE INSTITUTION OF INHERITANCE IN CHINA AND THE REPUBLIC OF BELARUS

The article presents not only the features of inheritance law in the People's Republic of China, but also provides an overview of inheritance relations and their regulation. A comparative analysis with the hereditary legislation of the Republic of Belarus is also carried out.

**Key words:** inheritance law; inheritance by law; inheritance by will; testator; heirs.

© Пашкевич К. В., 2024



Репозиторий БарГУ